# Задачы і функцыі дзяржаўнага прадпрыемства "ЦЦР"

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Цэнтр лічбавага развіцця" ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам і статутам прадпрыемства. Заснавальнікам дзяржаўнага прадпрыемства "ЦЦР" і органам дзяржаўнага кіравання з'яўляецца Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўнае прадпрыемства "ЦЦР" мае статус юрыдычнай асобы і з'яўляецца камерцыйнай арганізацыяй.

Мэтай дзейнасці дзяржаўнага прадпрыемства "ЦЦР" з'яўляецца ажыццяўленне дзейнасці, накіраванай на стварэнне і развіццё сістэм арганізацыйна-эканамічнага кіравання органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый Рэспублікі Беларусь, інтэграцыйных праектаў галіновага, рэгіянальнага і міждзяржаўнага ўзаемадзеяння, аказанне паслуг у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, баз дадзеных, развіццё сістэмы дзяржаўнай рэгістрацыі інфармацыйных рэсурсаў і сістэм, эксплуатацыя аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм.

Асноўнымі задачамі з'яўляюцца:

- аналіз, праектаванне і праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм;
- дзейнасць па апрацоўцы дадзеных з ужываннем праграмнага забеспячэння трэцяй асобы або ўласнага праграмнага забеспячэння;
- фундаментальныя і прыкладныя даследаванні, эксперыментальныя распрацоўкі ў галіне натуральных і тэхнічных навук (выкананне навукова-даследчых, вопытна-канструктарскай або вопытна-тэхналагічных работ, звязаных з напрамкамі дзейнасці ПВТ, у тым ліку ў галіне развіцця інфармацыйнага грамадства) і рэалізацыя вынікаў такіх даследаванняў і распрацовак;
- аказанне дзяржаўным органам і арганізацыям паслуг па арганізацыйна-тэхнічным забеспячэнні рэалізацыі мерапрыемстваў у сферы лічбавага развіцця, уключаных (планаваных да ўключэння) у дзяржаўныя і іншыя праграмы, рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў;
- інфармацыйна-аналітычнае суправаджэнне дзейнасці Міністэрства сувязі і інфарматызацыі;
- удасканаленне форм дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці ў сферы лічбавага развіцця, карэкціроўка тэхнічных нарматыўных прававых актаў у сферы лічбавага развіцця, патрабаванняў да стварэння, узаемадзеяння, сумяшчальнасці дзяржаўных лічбавых платформаў і інфармацыйных сістэм;
- дзейнасць па тэхнічнай і (або) крыптаграфічнай абароне інфармацыі, уключаючы прымяненне электроннага лічбавага подпісу; аналіз інфармацыйных патрэб юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў (сістэмны аналіз, бізнес-аналіз);
- кансультаванне па пытаннях выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у мэтах інавацыі (рэінжынірынга) бізнес-працэсаў з распрацоўкай тэхнічных патрабаванняў да інфармацыйных сістэм і праграмнага забеспячэння;
- аказанне аўтаматызаваных паслуг па пошуку, адбору, апрацоўцы і сартаванні дадзеных

па запытах трэціх асоб і прадастаўленню ім інфармацыі з выкарыстаннем сеткі Інтэрнэт;
- паслугі цэнтраў апрацоўкі дадзеных.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/zadachy-i-funkcyi-nirup-ipps*